www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта 17 лістапада 2005 года, № 20 (1928)

## БДУ-NEWS

### ДЗЕНЬ СТУДЭНТА

Сустрэча рэктара БДУ, прафесара В.І. Стражава са студэнтамі універсітэта адбудзецца 17 лістапада ў 18.00 у зале пасяджэнняў Вучонага савета (у будынку рэктарата). Традыцыйная штогадовая сустрэча з таленавітымі студэнтамі, якія дасягнулі выдатных поспехаў у навучанні, спорце, навуковых даследаваннях, а таксама ў міжнародных і рэспубліканскіх конкурсах і спаборніцтвах, прымеркавана да Міжнароднага дня студэнтаў. Удзел у ёй возьмуць каля 120 студэнтаў. Як і заўжды, можна будзе задаць рэктару пытанні на хвалюючыя тэмы, абмеркаваць актуальныя праблемы. Апрача таго, В.І. Стражаў уручыць падарункі і падзякі найлепшым.

**На 17 лістапада запланаваныя адказы В.І. Стражава на пытанні наведнікаў партала TUT.by, пачатак у 13 гадзін.**

### ЗАПРАШАЕМ НА "КІРМАШ ВАКАНСІЙ"

**30 лістапада** ўсе студэнты БДУ, якія жадаюць знайсці сабе працу ў вольны час, могуць пазнаёміцца з прапановамі сталічных прадпрыемстваў. "Кірмаш вакансій" адбудзецца ў актавай зале галоўнага корпуса БДУ (прасп. Незалежнасці, 4) з 12 да 15 гадзін. **Больш падрабязна пра гэтае мерапрыемства можна даведацца ў камітэце БРСМ БДУ па тэл. 209-52-61.**

### СТАНЬ ДОНАРАМ

**29 лістапада 2005 г.** у БДУ будзе праводзіцца традыцыйны Дзень донара. Пункт па заборы крыві размесціцца ў актавай зале галоўнага корпуса (прасп. Незалежнасці, 4) і будзе працаваць з 10.00 да 13.00. Аплата — 56.550 руб., а таксама гарбата і 2 дні вызвалення ад заняткаў.

Прыняць удзел у гэтай высакароднай справе могуць студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі БДУ, якія з'яўляюцца грамадзянамі Беларусі. Пры сабе неабходна мець пашпарт і запісацца загадзя — да 22 лістапада 2005 г.:

студэнтам — у дэканатах;

супрацоўнікам — у галоўным корпусе БДУ, каб. 204.

**Па дадатковую інфармацыю звяртацца ў сектар сацыяльнай работы УВРМ (галоўны корпус, каб. 204, тэл. 209-52-75).**

ПАДЗЕІ

# ГІСТОРЫЯ БДУ — ГІСТОРЫЯ КРАІНЫ



Каб стаць сапраўдным студэнтам БДУ, трэба не толькі паспяхова здаць уступныя іспыты, але і жыць яго інтарэсамі. 9, 10 і 11 лістапада больш за 4000 першакурснікаў зрабілі першыя крокі на шляху да пазнання гісторыі сваёй навучальнай установы.

Выстава, прысвечаная 60-годдзю Вялікай Перамогі і гісторыі універсітэта ў гады вайны, была арганізавана ў фае ліцэя БДУ. Акрамя кніг і дакументаў на ваенную тэматыку



можна было ўбачыць шматлікія фатаграфіі з фонду універсітэцкага музея, што распавядалі пра ўдзел студэнтаў і выкладчыкаў у франтавых баях, падполлі і партызанскім руху.

Знаёмства першакурснікаў з гісторыяй БДУ адбывалася падчас дыялогу-семінара — сучаснай формы навучальна-выхаваўчай работы з мэтай актывізацыі грамадзянскага, патрыятычнага і маральна-эстэтычнага выхавання моладзі.

Дух гераічнага мінулага нашай alma mater, якая прайшла праз знішчальныя гады вайны, перадала літаратурна-музычная кампазіцыя, складзеная паводле матэрыялаў фундаментальнага выдання "БДУ ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945гг.". Прэм'ера яе адбылася сёлета 29 чэрвеня. Менавіта ў гэты дзень у 1941 г. планавалася правесці ўрачыстае пасяджэнне Вучонага савета БДУ, прысвечанае 20-годдзю універсітэта. Але святкаванне не адбылося: пачалася вайна. Літаратурна-музычная кампазіцыя так і называлася — "Юбілей, перапынены вайной". Першымі яе ўбачылі супрацоўнікі БДУ — ветэраны вайны, члены Вучонага савета БДУ, дэканы, выкладчыкі, а таксама прадстаўнікі студэнцкага актыву.

Кампазіцыя выбудаваная так, нібы перагортваецца кніга: успаміны ўдзельнікаў вайны змяняюцца сухімі радкамі дакументаў, а эмацыйную атмасферу ваенных часоў гледачам дапамаглі адчуць песні, напісаныя ў тыя гады. Прэм'ера мела вялікі поспех, таму з ініцыятывы рэктара БДУ, прафесара В.І. Стражава было вырашана правесці серыю такіх культурна-патрыятычных акцый з удзелам студэнтаў, якія паступілі ў наш універсітэт сёлета.



**Вольга, факультэт журналістыкі:**

— Да гэтага дня я амаль нічога не ведала пра гісторыю роднага універсітэта. Зараз нават сорамна за гэта. Падчас кампазіцыі было правільна заўважана, што гісторыя БДУ — гэта гісторыя нашай краіны. І добра, што кіраўніцтва прыдумала такую незвычайную форму, каб данесці важную інфармацыю да студэнтаў. Кожны пацвердзіць: што цікава, тое лепей засвойваецца.

**Аляксандр, факультэт міжнародных адносін:**

— Мы яшчэ толькі пачалі вучыцца, а БДУ ўжо стаў сапраўды другім домам. Я ганаруся, што з'яўляюся студэнтам лепшай ВНУ краіны. А пасля гэтага спектакля гонар узрос стакроць: ён ужо мае сапраўдны падмурак са звестак з гісторыі універсітэта. Пажадана, каб усе лекцыі праходзілі гэтак жа цікава!

**Таццяна, факультэт журналістыкі:**

— Калі чытаеш кніжку па гісторыі, інфармацыя проста запамінаецца. А калі бачыш такія пастаноўкі, як сёння, інфармацыя сапраўды закранае цябе. Нібы ажыла гісторыя. А яе трэба добра ведаць, каб быць сапраўдным патрыётам.

**Настасся, геаграфічны факультэт:**

— Мяне вельмі ўразіў выступ ветэрана Людмілы Андрэеўны Палавінкінай. Асабліва запомнілася пра інтэрнат. Які жах — узімку не ацяплялі, шкла ў вокнах не было! А яшчэ — пра голад, што карткі не было на што атаварваць. Як яны маглі вучыцца ў такіх умовах?

**Алена, ФФСН:**

— Мне цяжка ўявіць, як бы я сябе паводзіла ў тых жудасных абставінах. Ці далучылася б да тых студэнтаў, хто ваяваў на франтах, ці засталася б змагацца ў тыле, ці ў партызаны б рушыла…



**Дзяўчаты з Інстытута тэалогіі:**

— Выступленне рэктара вельмі зацікавіла. Па-першае, інфармацыя карысная: дзе і што ў хуткім часе будзе пабудавана. Па-другое, гэта ж магчымасць бліжэй пазнаёміцца, незвычайна было ўяўляць сабе прафесара Стражава 44 гады таму — студэнтам, які здаваў лабараторныя ў тым самым будынку, дзе зараз у яго кабінет.

**Максім, юрыдычны факультэт:**

— Спадабаліся песні ваенных, усё было дынамічна, цікава і ўспрымалася на дзіва лёгка. А інфармацыя гэтая вельмі спатрэбіцца: у нас жа цяпер ёсць курс "Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны".

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ, Настасся ЮДЧЫЦ**

**Фота Юліі ПАПОВАЙ і Аляксандра СНАПКА**

СУПРАЦОЎНІЦТВА

# ПАГАДНЕННЕ З УНІВЕРСІТЭТАМ ЧОН БУК

Пагадненне пра супрацоўніцтва з Нацыянальным універсітэтам Чон Бук Рэспублікі Карэя падпісаў рэктар нашага універсітэта, прафесар В.І. Стражаў 3 лістапада. Для падпісання дагавора ў Беларусь прыбыла карэйская дэлегацыя ў складзе прэзідэнта названай ВНУ Шына Банга Унга і дэкана Цэнтра міжнароднага навучання Пака Су Гіля. Пагадненне прадугледжвае супрацоўніцтва на 5 гадоў па наступных напрамках: абмен прафесарска-выкладчыцкім саставам і студэнтамі, правядзенне сумеснай даследчыцкай, выдавецкай дзейнасці і сумеснай навучальнай праграмы, удзел у навуковых канферэнцыях і семінарах, абмен матэрыяламі па выніках навуковых даследаванняў і іншай інфармацыяй, ажыццяўленне спецыяльных кароткатэрміновых навуковых праграм.

**Алена КУРХІНЕН**
**Фота Юліі ПАПОВАЙ**



НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

# НА БЛІНЫ Ў "ЧАЦВЁРКУ"



45-гадовы юбілей адзначыў 10 лістапада інтэрнат № 4. На свята насельнікі "чацвёркі" падрыхтавалі адпаведную праграму: працавалі святочныя "станцыі" — "Кітайскі квартал", псіхалагічная гасцёўня, фотавыстава "Учора, сёння...", фотасалон, "Кулінарны паўстанак", "Усходні базар" і інш. Гасцямі свята сталі рэктар В.І. Стражаў, прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях У.В. Сувораў, дырэктар студгарадка М.Б. Чарапеннікаў, дэкан юрыдычнага факультэта С.А. Балашэнка, дэкан факультэта міжнародных адносін А.В. Шарапа і інш.

Гасцей юбілейнага святкавання чакалі і песні, і танцы, і бліны з малінавым сочывам, і псіхалагічныя гульні. Пасля захапляльнай экскурсіі па інтэрнаце госці пакінулі ў памятнай кнізе "чацвёркі" свае віншаванні і пажаданні. Закончылася свята ў клубе "Night Star".

**Паводле інфармацыі грамадскай інфармацыйнай службы студгарадка БДУ**
**Фота Максіма КАВАЛЕНКІ**

АКТУАЛЬНА

# ПРАЦА ДЛЯ ПРАГРАМІСТАЎ

***"Мы шукаем таленты" — так вобразна можна абазначыць канцэпцыю IV спецыялізаванага кірмаша-выставы пад назвай "Дні кар'ернага росту", які прайшоў 2 лістапада на базе БДУ. Ён быў арганізаваны кіраўніцтвам факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Белдзяржуніверсітэта разам з асацыяцыяй распрацоўшчыкаў інфармацыйных тэхналогій "Інфапарк".***

На тэматычных стэндах беларускія фірмы-вытворцы софтвернага абсталявання і праграмнага забеспячэння паказалі ўсім жадаючым максімум інфармацыі пра сябе і сваю дзейнасць. Падчас выставы адбываліся прэзентацыі IT-кампаній, а таксама майстар-класы, якія правялі спецыялісты і менеджэры 16 вядучых беларускіх IT-кампаній — "Epam Systems", "Itransition", "Elilink", "БелХард Груп", "Рэд Графік Сістэм", "Топ Софт", "Сістэмныя тэхналогіі", "СофтЛайнБел" і інш. Тэматыка майстар-класаў закранала мноства аспектаў дзейнасці праграміста-пачаткоўца: "Працаўладкаванне ў IT-кампанію: як атрымаць перавагу", "25 памылак пачынаючага NET-распрацоўшчыка", "Бесперапынная інтэграцыя — неабходная ўмова для паспяховага праекта". Генеральным спонсарам кірмаша-выставы выступіла фірма "Epam Systems" — прадстаўнік айчыннай праграмнай індустрыі на сусветным рынку.

Важнасць мерапрыемстваў такога кшталту для студэнтаў і маладых спецыялістаў у галіне інфармацыйных тэхналогій адназначна. Кожны, хто наведаў кірмаш, атрымаў рэальны шанц па выніках субяседавання прайсці практыку ў абранай фірме, супрацоўнічаць з ёй, прафесійна расці і, пры адпаведным жаданні і здольнасцях, добра працаўладкавацца ў будучыні.

**Лідзія СЕМЯНКОВА**

ДАЛУЧАЙЦЕСЯ!

# ЗАНЯТКІ ПА ГРАМАДЗЯНСКАЙ АБАРОНЕ



1 лістапада ў сховішчы па вул. Бабруйскай, 9 пасля 10-гадовага перапынку пачаў дзейнічаць навучальны клас па грамадзянскай абароне. Заняткі будуць праводзіцца як сярод студэнтаў, так і сярод супрацоўнікаў універсітэта. Тэмы заняткаў прапануюцца самыя разнастайныя: "Парадак дзеянняў неваенізаваных фарміраванняў пры стыхійных бедствах, вытворчых аварыях, пры пагрозе і правядзенні тэрарыстычных актаў", "Характарыстыка моцнадзейных атрутных рэчываў па ўздзеянні на арганізм чалавека. Меры засцярогі", "Сродкі індывідуальнай абароны, правілы іх захоўвання, выкарыстання і выдачы" і інш. У далейшай навучальнай праграме таксама плануецца паказ вучэбных фільмаў пра дзеянні ў надзвычайных сітуацыях. Праводзіць заняткі будзе начальнік штаба грамадзянскай абароны БДУ С.С. Піпожнік.

**Кіраўнікі падраздзяленняў і адказныя за правядзенне заняткаў па грамадзянскай абароне могуць падаваць заяўкі на правядзенне заняткаў па тэл. 209-55-20.**

Аксана КАХНО
Фота Аляксандра ДЗІДЗЕНКА

ВЫСТАВЫ

## МОЛАДЗЬ УЧОРА І СЁННЯ

Тэматычная кніжная выстава, прысвечаная Міжнароднаму дню студэнта, прайшла 9—11 лістапада ў фае ліцэя БДУ. Кнігі былі размеркаваны па раздзелах "Старонкі гісторыі" (літаратура пра першыя універсітэты свету) і "Студэнцкая моладзь у зменлівым свеце" (выданні і публікацыі пра стан сённяшняй моладзі).

## ПЕЙЗАЖ ДЛЯ БІБЛІЯТЭКІ

Мастацкія творы былой супрацоўніцы Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Святланы Грыгор'евай былі прадстаўлены на выставе ў чытальнай зале для прафесарска-выкладчыцкага саставу, навуковых супрацоўнікаў і аспірантаў. На 20 карцінах можна было ўбачыць разнастайныя пейзажы: і беларускія краявіды, і горныя, і далёкаўсходнія. 9 лістапада адбылася сустрэча з мастачкай, падчас якой яна адказала на шматлікія пытанні. Святлана Ільінічна падаравала бібліятэцы адну з сваіх карцін. На сайце www.svetlanagrigorieva.land.ru можна бліжэй пазнаёміцца з творчасцю мастачкі.

**Паводле інфармацыі аддзела гуманітарна-асветніцкай работы падрыхтавала Аксана КАХНО**

ПАДПІСКА—2005

## "ВЕСНІК БДУ"

***Пачалася падпіска на перыядычныя выданні на першае паўгоддзе 2006 года.***

**Падпісная цана на часопіс "Веснік БДУ" па серыях:**

Серыя I — фізіка, матэматыка, інфарматыка (№ 1, студзень; № 2, май):
індывідуальная (індэкс 74851) — 15 780 р.;
ведамасная (індэкс 748512) — 43 097 р.

Серыя II — хімія, біялогія, геаграфія (№ 1, люты; № 2, чэрвень):
індывідуальная (індэкс 74852) — 15 780 р.;
ведамасная (індэкс 748522) — 43 097 р.

Серыя III — гісторыя, філасофія, псіхалогія, паліталогія, сацыялогія, эканоміка, права (№ 1, сакавік):
індывідуальная (індэкс 74853) — 7 890 р.;
ведамасная (індэкс 748532) — 21 548 р.

Серыя IV — філалогія, журналістыка, педагогіка (№ 1, красавік):
індывідуальная (індэкс 74854) — 7 890 р.;
ведамасная (індэкс 748542) — 21 548 р.

**Падпісацца на часопіс "Веснік БДУ" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь.**

Часопіс "Веснік БДУ" ўсіх чатырох серый можна набыць:
у кіёску галоўнага корпуса БДУ (прасп. Незалежнасці, 4);
у кіёску «Універсітэцкая кніга» (вул. Ленінградская, 2);
у кнігарні "Акадэмічная кніга" (прасп. Незалежнасці, 72, тэл. 232-00-52);
серыі 3, 4 — у кіёску па вул. К. Маркса, 31 (будынак гуманітарных факультэтаў БДУ).

**Самы танны і надзейны спосаб атрымаць часопіс — гэта падпіска.**

ПОМНІКІ БДУ

*Газета "Універсітэт" працягвае знаёміць чытачоў з жыццёвымі і творчымі лёсамі асветнікаў, чые скульптуры ўпрыгожваюць унутраны дворык БДУ. Сённяшні наш расповед — пра беларускага першадрукара Францішка СКАРЫНУ.*



# "ПАЧАТАК УСЯКАЙ ДОБРАЙ НАВУКІ"

На працягу стагоддзяў людзі шукалі спосаб друкаваць кнігі. Спробы друкаваць тэксты з наборнай формы рабілі ў Кітаі, Японіі, Карэі, Нідэрландах, Бельгіі, Італіі, Францыі. Аднак поспех спрыяў толькі Іагану Гутэнбергу. Вынаходства друкарскага станка стала адным з найбольшых адкрыццяў эпохі Адраджэння, паваротным пунктам у гісторыі чалавецтва. У 1447 г. Гутэнберг пачаў рэгулярны выпуск кніг у нямецкім горадзе Майнцы: гэта былі невялікія брашуры і асобныя аркушы. Потым ён надрукаваў календары, лацінскую граматыку. А першым буйным выданнем Гутэнберга стала Біблія.

Справу Гутэнберга падхапілі друкары Германіі, Італіі, Нідэрландаў, Чэхіі, Польшчы і іншых краін. Наш зямляк Францішак Скарына адным з першых адчуў, што кніга народу патрэбна не менш за хлеб.

Час Адраджэння адметны тым, што тады развівалася пісьменства, культура, асвета, абмяркоўваліся пытанні зямнога прызначэння чалавека, яго маральнага ўдасканалення. Гэта быў перыяд духоўнага пералому чалавецтва. Эпоха Адраджэння нарадзіла Францыска Скарыну — чалавека невычэрпнай энергіі, першадрукара, навукоўца-энцыклапедыста, асветніка, гуманіста, паэта, медыка, астранома і батаніка.

Францыск Скарына нарадзіўся ў Полацку. Навукоўцы мяркуюць, што нарадзіўся ён у год сонечнага зацьмення — 1486-ы, паводле некаторых звестак — 1490-ы. Бацька славутага асветніка Лук'ян быў купцом, гандляваў скурамі і футрамі. Францыск меў старэйшага брата Івана, які пасля смерці бацькі працягваў яго справу. Але Францішак меў іншыя схільнасці...

Пачатковую адукацыю (уменне чытаць і пісаць) Скарына, як мяркуюць, атрымаў у бацькоўскім доме. Атмасфера купецкага дома абудзіла ў яго ахвоту да пазнання свету, таямніц прыроды. Каб заняцца навукай, Францішку неабходна было засвоіць лацінь — тагачасную мову адукацыі. Відаць, вучыўся ён у Вільні або ў школе пры бернардзінскім манастыры ў Полацку. У 1504 г. дапытлівы палачанін адпраўляецца ў Кракаўскі універсітэт, дзе абараніў ступень бакалаўра. У 1507—1511 гг. Скарына працаваў і вучыўся медыцыне ў Заходняй Еўропе — у Даніі на пасадзе каралеўскага сакратара пры каралю Гансе (Яне).

У 1512 г. у Падуанскім універсітэце Скарына бліскуча вытрымаў экзамен на годнасць доктара медыцыны. Пасля трыумфу ў Італіі звесткі пра яго зноў губляюцца: можа, ён вучыўся друкарскай справе ў Дакіі (тэрыторыя цяперашняй паўднёвай Румыніі), дзе тады існавала славянская друкарня.



Пры падтрымцы віленскіх мецэнатаў Якуба Бабіча і Багдана Онькава ён стварыў у Празе першае беларускае выдавецтва. На аснове лацінскіх, чэшскіх, старажытнаяўрэйскіх і царкоўнаславянскіх тэкстаў пераклаў на тагачасную беларускую мову, а ў 1517—1519 гг. пракаменціраваў і надрукаваў 23 ілюстраваныя кнігі Бібліі.

Вярнуўшыся каля 1520 г. на радзіму, Скарына ажаніўся. Ён стварыў у Вільні выдавецтва і абсталяваў у доме Бабіча друкарню, пракаменціраваў і выдрукаваў па-царкоўнаславянску "Малую падарожную кніжку" (каля 1522 г.). У 1525 г. Скарына выдаў сваю апошнюю кнігу "Апостал". Адначасова ён служыў сакратаром і доктарам у віленскага біскупа Яна ды разам з братам Іванам займаўся камерцыяй.

Ёсць меркаванне, што ў канцы 1520-х гг. Скарына наведаў Маскву: спрабаваў зацікавіць маскоўскі ўрад кнігавыдавецкай справай. Ён павёз туды Біблію. Але маскоўскі князь Васіль III Іванавіч загадаў ягоныя кнігі канфіскаваць і публічна спаліць.

Цяжкім аказаўся для друкара 1529 г.: памёр брат Іван, потым — жонка Маргарыта, пакінуўшы на руках Скарыны малога сына Сымона. Яе сваякі пачалі адсуджваць у Скарыны маёмасць. У 1532 г. друкар быў арыштаваны за братавы пазыкі. Выпусцілі яго праз 10 дзён дзякуючы захадам пляменніка Рамана. Скарына запатрабаваў кампенсацыі за беспадстаўны арышт і прычыненую яму шкоду і атрымаў ад вялікага князя Жыгімонта Казіміравіча спецыяльны прывілей: ён вызваляўся з-пад юрысдыкцыі ўсіх мясцовых судоў, а ўсе абвінавачванні супраць яго маглі прад'яўляцца толькі ў вялікакняскі суд.

З 1535 г. асветнік працуе ў пражскім батанічным садзе на Градчанах у чэшскага караля Фердынанда. Скарына, відаць, і заснаваў той сад. Пражскія гады жыцця друкара прайшлі спакойна. Звесткі пра Скарыну адсутнічаюць з 1541 года. Памёр Францыск Скарына каля 1551 года. Месца яго пахавання невядома.

Варта зазначыць, што Скарына здзейсніў першае ў гісторыі ўсходнеславянскай культуры выданне Бібліі. Скарынава Біблія выйшла ў свет раней за нямецкую Лютэраву і раней за Біблію па-англійску. Яна з'явілася амаль на паўстагоддзя раней за польскую Біблію і на 47 гадоў раней за "Апостал" — першую друкаваную кнігу ў расіян, выдадзеную беларусамі Іванам Фёдаравым і Пятром Мсціслаўцам.

Скарына — пачынальнік папулярных у XVI—XVII стст. жанраў беларускай літаратуры: прадмоваў, пасляслоўяў, публіцыстыкі, акафіста, сілабічных вершаў. Ён яскрава раскрыўся ў прадмовах як творчая асоба — пісьменнік, перакладчык, філосаф. У іх першадрукар выказваў свае грамадскія і асветніцкія погляды, заклікаў да ўмацавання правапарадку, да стварэння справядлівых заканадаўчых кодэксаў, тлумачыў незразумелыя словы і звароты, змяшчаў рэлігійныя легенды, а таксама звесткі па гісторыі, геаграфіі, этнаграфіі, філасофіі, астраноміі. Так, у "Малой падарожнай кніжцы" Скарына змясціў розныя каляндарныя і астранамічныя звесткі (беларускія назвы месяцаў, знакаў задыяка) — усё, што неабходна чалавеку ў дарозе. "Псалтыр" Скарына адрасаваў "дзецям малым як пачатак усякай добрай навукі", а таксама дарослым у якасці настольнай кнігі, душавыратавальнага чытання. Па "Пеўніцах" можна было навучыцца музыцы. Засвоіць арыфметыку — па кнігах Майсеевых, геаметрыю і астраномію — па кнізе Ісуса Навіна.

Скарына заснаваў і яшчэ адзін "мікражанр" у беларускай літаратуры — анатацыю да кнігі. Адрасуючы плён сваёй працы шырокаму чытачу, ён клапаціўся пра яе даступнасць, тлумачыў сюжэт, кампазіцыю.

У літаратурнай спадчыне Скарыны спалучаецца традыцыйная тэалогія з характэрным для эпохі Адраджэння вальнадумствам, а каментары да старажытных тэкстаў пазбаўляюцца сярэдневяковага аскетызму, перарастаюць ва ўзнёслае красамоўства. Немалаважнае значэнне ў кнігах адводзілася тэме любові да роднай зямлі. Асветнік быў патрыётам Айчыны, роднай мовы, таму і праславіў біблейскую гераіню Юдзіф, якая выратавала свой народ, адсекшы галаву начальніку чужаземнага войска Алаферну. У сувязі з гэтай легендай Скарына выказвае думкі пра патрыятычны абавязак кожнага чалавека перад сваім народам, вернасць радзіме, глыбокую прыхільнасць чалавека да зямлі, на якой ён нарадзіўся.

Сярод ілюстрацый да кніг ёсць партрэт самога беларускага гуманіста. Смела адступаючы ад канонаў, ён падаў уласную выяву ў Бібліі. Даследчык выяўленчага мастацтва В.В. Стасаў вельмі высока ацаніў ілюстрацыі скарынаўскіх выданняў. Ён прызнаваў іх "важную ролю сярод славянскіх твораў ксілаграфічнага майстэрства", у іх яскрава выступае "славянскі тып" ва ўсёй своеасаблівасці, не выключаючы і па-народнаму характэрнай вопраткі, і чыста знешніх самабытных упрыгожанняў.

Францыска Скарыну можна параўнаць з такімі магутнымі постацямі, як Леанарда да Вінчы, Эразм Ратэрдамскі ці Рафаэль. Навуковае скарыназнаўства бярэ свой пачатак яшчэ ў 1666 г., калі бібліёграф С. Мядзведзеў зрабіў бібліяграфічнае апісанне асобных выданняў Ф. Скарыны. У 1888 г. выйшла манаграфія П. Уладзімірава "Доктар Францыск Скарына". У 1917 г. адзначалася 400-годдзе пачатку выдавецкай справы Скарыны. У 1926 г. Ігнат Дварчанін абараніў у Карлавым універсітэце доктарскую дысертацыю "Францыск Скарына як культурны дзеяч і гуманіст на беларускай глебе". З пачатку XX ст. пачынаецца агульнае захапленне працай Скарыны і яго спадчынай. У 1958 г. выйшла кніга М. Алексютовіча "Скарына, яго дзейнасць і светапогляд" — першае манаграфічнае даследаванне пра Ф. Скарыну. У 1988 г. выдадзены энцыклапедычны даведнік "Францыск Скарына і яго час". Многа кніг і даследаванняў выдаецца і ў наш час.

У 1967 г. уведзены дыплом і медаль Ф. Скарыны — найвышэйшая ўзнагарода за мастацкае і паліграфічнае афармленне кніг. Мастак Арлен Кашкурэвіч стварыў першы медаль з выявай Ф. Скарыны. 23 лістапада 1988 г. Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларусі ўстанавіў медаль Францыска Скарыны для ўзнагароджання работнікаў навукі, народнай адукацыі і культуры за выдатныя даследаванні гісторыі Беларусі, дасягненні ў галіне нацыянальнай мовы, літаратуры, мастацтва, кнігавыдання, культурна-асветнай дзейнасці, а таксама прапаганду культурнай спадчыны беларускага народа. У 1995 г. устаноўлены ордэн Францыска Скарыны для ўзнагароджання грамадзян за такія ж дасягненні.

Ягелонскі і Падуанскі універсітэты ў 1991—1992 гг. устанавілі мемарыяльныя дошкі, прысвечаныя нашаму першадрукару. Помнікі Францыску Скарыну ёсць у Полацку, у пражскім парку на Градчанах, у Калінінградзе. 30 кастрычніка 1998 г. у дворыку БДУ быў урачыста адкрыты першы помнік Францыску Скарыну ў Мінску.

**Падрыхтавалі Наталля НАЗАРАВА і Ірына ШЫК**
**Фотаздымкі Юліі ПАПОВАЙ**

## ПОМНІК СКАРЫНУ

Першапачаткова помнік Францыску Скарыну быў зроблены з гіпсу скульптарам С. Адашкевічам. З 1994 г. кіраўніком праекта стаў Анатоль Белы. Паводле яго заказу браты Пархоменкі выканалі помнік у медзі, ён жа і перадаў яго ў дарунак БДУ. Урачыстае адкрыццё помніка Ф. Скарыну адбылося 30 кастрычніка 1998 г. Скульптар І. Голубеў стварыў бронзавы рэльеф "Францыск Скарына" і алфавіт першадрукара, а таксама два бронзавыя рэльефы з літарамі "А" і "Я". Пазней паводле праекта архітэктара С. Клецкіна з дапрацоўкай архітэктара В. Ягадніцкага быў зроблены гранітны пастамент і адліта бронзавая шыльда з адмысловым тэкстам "Помнік Францыску Скарыну". Помнік Францыску Скарыну ў дворыку БДУ — першы помнік беларускаму першадрукару, пастаўлены ў Мінску.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

## ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*На 14 лістапада бягучага года выдадзена 193 кнігі і брашуры агульным аб'ёмам 1523,73 уліково-выдавецкага аркуша. З іх 141 вучэбнае, 37 навуковых, 15 даведачных выданняў. У друкарні таксама знаходзіцца 156 арыгіналаў-макетаў агульным аб'ёмам 1204,31 уліково-выдавецкага аркуша.*

*Н.К. Зубовская, Н.М. Смирнова.* **Stereotype und Wirklichkeit uber Deutschland / Стереотипы и действительность Германии.** Навучальна-метадычны дапаможнік змяшчае актуальныя аўтэнтычныя краіназнаўчыя тэксты і матэрыялы і можа выкарыстоўвацца на занятках з аспірантамі, магістрантамі, студэнтамі старэйшых курсаў.

*Т.В.Лашук, Л.П.Воробьева.* **Lese- und Ubungsbuch fur Wirtschaftsdeutsch / Книга для чтения и упражнений по немецкому языку в сфере экономики.** У практыкуме можна знайсці аўтэнтычныя матэрыялы па актуальных праблемах сучаснай эканамічнай і працоўнай дзейнасці, кантрольныя работы, заснаваныя на прынцыпах камунікатыўнай комплекснасці, прагрэсіі і дыферэнцыяцыі заданняў.

*П.И. Зелинский.* **Великая Отечественная война советского народа в контексте Второй мировой войны.** У дапаможніку для навучэнцаў Інтэрліцэя БДУ выкладаюцца пытанні палітыкі Савецкага Саюза і краін Еўропы напярэдадні і ў перыяд Другой сусветнай вайны.

*В.И.Сенчило, Ю.В.Сенчило.* **Лекарственные растения Беларуси.** У дапаможніку разглядаюцца асноўныя дзікія і некаторыя культываваныя на тэрыторыі Беларусі лекавыя расліны. Для ўсіх відаў указваюцца ўмовы росту, час нарыхтоўкі і сушкі сыравіны, хімічны склад, фармакалагічныя ўласцівасці і прымяненне.

*Н.А. Царюк, Л.А. Козик.* **Новейшая история западных славян с 1914 г. до начала XXI в.** Навучальна-метадычны комплекс прызначаны для арганізацыі самастойнай работы студэнтаў гістарычнага факультэта і кантролю яе па модульна-рэйтынгавай сістэме.

*А.В.Дулов, А.С. Рубис.* **Основы формирования криминалистической теории доказывания.** Аўтары манаграфіі, разглядаючы праблему доказвання злачынстваў на ўсіх этапах змагання са злачыннасцю, фармулююць асновы крыміналістычнай тэорыі доказвання.

**Украінская літаратура. Ч. 1. Старажытная літаратура XI—XVIII ст.** У дапаможніку прадстаўлены аўтары і творы, якія найбольш яскрава характарызуюць асноўныя перыяды старажытнай украінскай літаратуры — сярэднявечча, Рэнесанс і барока.

**Федор Макарьевич Нечай. К 100-летию со дня рождения.** Выданне з серыі "Memoria et Gloria" прысвячаецца памяці прафесара, дэкана гістарычнага факультэта БДУ ў 1947—1953 гг., заснавальніка беларускай школы антыказнаўцаў.

**Science and Innovation in BSU.** Выданне распавядае пра развіццё навуковай і інавацыйнай сферы ў БДУ. Кніга багата ілюстравана графікамі, схемамі, фотаздымкамі.

**Массовое обслуживание. Потоки, системы, сети: материалы международной научной конференции "Математические методы повышения эффективности функционирования телекоммуникационных сетей".** У зборніку падаюцца вынікі даследаванняў у галіне распрацоўкі і аптымізацыі мадэлей працэсаў перадачы інфармацыі ў тэлекамунікацыйных сетках з выкарыстаннем апарату тэорыі сістэм і сетак масавага абслугоўвання.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы**

АСОБЫ

# УРОКІ ЗДАРОЎЯ А.І. МЯЦЕЛЯ

***Аляксандр Іванавіч Мяцель працуе ў ліцэі БДУ з самага яго заснавання. Гэтага настаўніка фізкультуры ведае кожны ліцэіст. У чым жа сакрэт урокаў здароўя — вырашыў расказаць ён сам.***



**— Фізкультура — такая ж неабходная дысцыпліна, як і ўсе астатнія?**

— Я заўжды свой прадмет называю ўрокамі здароўя. А ці не настолькі ж важнае для нас здароўе, як і розум? Без здароўя нават самая простая задача будзе не пад сілу.

**— Як адчуваеце сябе ў іпастасі "Найлепшага ліцэйскага настаўніка 2004 года"?**

— Выкладчык, якому прысудзілі такое званне, павінен быць адданы сваёй справе, павінен умець зацікавіць сваімі заняткамі, але самае галоўнае — ён павінен быць старэйшым таварышам для сваіх вучняў. Я заўжды да гэтага імнуўся і буду імкнуцца. Атрымаць званне найлепшага настаўніка вельмі прыемна, але адначасова і вельмі адказна. Для мяне гэты тытул — стымул не стаяць на месцы, а імкнуцца наперад, удасканальвацца.

**— Для вас больш важна павага калег-настаўнікаў ці вучняў?**

— Вучняў, бо менавіта іх павага ці непавага — самая аб'ектыўная ацэнка і чалавечых і педагагічных якасцей.

**— Ці ўзнікалі ў вас калі-небудзь канфлікты з вучнямі?**

— Сур'ёзных канфліктаў ніколі не ўзнікала, але супярэчнасці былі. Заўсёды атрымлівалася вырашыць іх мірнымі перамовамі.

**— Ці ёсць у вас якія-небудзь захапленні?**

— Мне падабаецца пісаць вершы. Калі я вучыўся ў пятым класе, у нас рускую літаратуру выкладаў настаўнік, які амаль на кожным уроку ў якасці дамашняга задання даваў нам складаць вершы. Мяне настолькі гэта захапляла, што я мог сядзець і прыдумваць розныя рыфмоўкі некалькі гадзін. І зараз у свабодную хвілінку, калі ў мяне добры настрой, я саджуся і складаю вершы.

**— Ці абавязкова добры настаўнік павінен быць добрым чалавекам?**

— Так, бо ў абавязкі выкладчыка ўваходзіць не толькі даць неабходныя веды па сваёй дысцыпліне, але разам з бацькамі выхоўваць у дзіцяці чалавечыя якасці. А для гэтага педагог сам павінен мець гэтыя якасці.

**— Ці былі калі-небудзь моманты, калі вам хацелася пакінуць ліцэй?**

— Такога ніколі не было. Я ўжо настолькі прырос душой да яго, да ліцэістаў, да педагагічнага калектыву, што пакінуць усё гэта — што здрадзіць самому сабе.

**— Як вы вырашылі стаць выкладчыкам?**

— На мой выбар паўплывалі мае школьныя настаўнікі, асабліва Аляксандр Рыгоравіч Дубровін, выкладчык геаграфіі. Ён быў вельмі актыўным чалавекам, любіў хадзіць у паходы і ўдзельнічаць у спартыўных спаборніцтвах. Мне вельмі хацелася стаць падобным да яго. Вось чаму я спачатку вырашыў паступаць на геаграфічны факультэт, але потым пабаяўся, што не паступлю... І падаў дакументы на факультэт фізічнага выхавання ў Кіраваградскі дзяржаўны педагагічны універсітэт. Я ўжо 25 гадоў працую выкладчыкам фізкультуры і яшчэ ні разу не расчараваўся ў выбары.

**— Што з'яўляецца для вас самай вялікай падзякай?**

— Самая вялікая падзяка для мяне — добрыя вынікі вучняў. Іх вынікі — гэта і мае вынікі, гэта ацэнка маёй працы.

**Вікторыя ПЫЖЫК**
**Фотаздымак Юліі ПАПОВАЙ**

ВЕСТКІ З ФАКУЛЬТЭТАЎ

# СУСТРЭЧА З МАСКОЎСКІМ ПАЭТАМ

***Маскоўскі паэт Дзмітрый Вадзеннікаў выступіў 27 кастрычніка на філалагічным факультэце БДУ.***

Аўтар вершаваных зборнікаў "Дзядоўнік", "Holiday", "Як трэба жыць — каб быць каханым", "Мужчыны таксама могуць імітаваць аргазм", "Смачны абед для абыякавых катоў", ён запатрабаваны ў літаратурных колах: ладзіць шматлікія аўтарскія вечарыны, вядзе радыёперадачы.

У актавай зале філфака дарослы, выносісты мужчына выглядаў хлопчыкам, які прытуліўся на краёчку крэсла. Але ад яго вершаў прамяніла магутная энергетыка. Адчувалася, што ў сваіх творах паэт крайне — нават бязмежна! — шчыры, і ад гэтай шчырасці ўсім стала цяплей.

Пасля выступу — пытанні, кветкі, аўтографы. Пра Мінск Дзмітрый выказваўся вельмі цёпла. На наступны дзень ён напісаў у сваім віртуальным дзённіку: "Дзякую людзям на вуліцах, якія настолькі добразычлівыя, дзякую людзям на вечарыне, якія так умеюць слухаць вершы і якіх так шмат".

**Таццяна СВЕТАШОВА,**
**студэнтка філалагічнага факультэта**

## АБ'ЯВЫ

**Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ абвяшчае конкурс на замяшчэнне пасад:**

**Загадчыкаў кафедраў:** мастацтваў, рэабіліталогіі, эканамічнага права;

**Дацэнтаў кафедраў:** мастацтваў, рэабіліталогіі;

**Старшых выкладчыкаў кафедраў:** мастацтваў, гуманітарных дысцыплін, сацыяльнай работы;

**Выкладчыкаў кафедраў:** дзяржаўнага права, рэабіліталогіі, эканамічнага права, эканомікі і кіравання бізнесам.

Тэрмін конкурсу — 1 месяц з дня апублікавання аб'явы.

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

## АБ'ЯВЫ

**ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў студзені-сакавіку 2006 г. выкладчыкаў і спецыялістаў Белдзяржуніверсітэта**

**1.** Замежная мова (англійская мова) як аснова сацыяльнай дзелавой камунікацыі сучаснага спецыяліста (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў) — **09.01—18.03**, заняткі 2 разы ў тыдзень;

**2.** Вялікая Айчынная вайна ў кантэксце ваенна-палітычнай гісторыі Беларусі (для выкладчыкаў) — **16.01—28.01;**

**3.** Карупцыя і яе грамадская небяспека (для адміністрацыйна-кіраўніцкага складу і работнікаў аддзелаў па выхаваўчай і ідэалагічнай рабоце ВНУ, адказных сакратароў і работнікаў прыёмных камісій) — **16.01—21.01;**

**4.** Школа маладога спецыяліста: адукацыйныя тэхналогіі ў выкладанні прыродазнаўча-матэматычных дысцыплін (для выкладчыкаў) — **23.01—28.01, 27.02—04.03;**

**5.** Рэлігіі і канфесіі ў Рэспубліцы Беларусь: гісторыя і сучаснасць (для выкладчыкаў) — **23.01—04.02;**

**6.** Асноўныя напрамкі рэалізацыі маладзёжнай палітыкі ў кантэксце ідэалагічнай і выхаваўчай работы ў ВНУ (для начальнікаў упраўленняў (аддзелаў) па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) — **23.01—03.02;**

**7.** Навучальны і выхаваўчы працэс ва ўмовах мадэрнізацыі сістэмы вышэйшай адукацыі (для выкладчыкаў і спецыялістаў вышэйшай школы) — **30.01—11.02;**

**8.** Сучасныя тэхналогіі выкладання сацыяльна-эканамічных дысцыплін (для загадчыкаў кафедраў, рэзерву загадчыкаў кафедраў) — **06.02—11.02, 13.03—18.03;**

**9.** Метадалогія і методыка дысертацыйнага даследавання (для маладых выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў) — **06.02—18.02;**

**10.** Студэнцкая сезонная працоўная міграцыя (для арганізатараў студэнцкіх будаўнічых атрадаў і спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) — **13.02—17.02, 03.04—07.04;**

**11.** Выкарыстанне пакета "Microsoft Office 2000" у навучальным працэсе і навуковых даследаваннях (для выкладчыкаў, асістэнтаў, навуковых супрацоўнікаў, вучэбна-дапаможнага персаналу ВНУ) — **13.02—21.04**, заняткі 2 разы ў тыдзень;

**12.** Здароўезберагальныя тэхналогіі ў навучальна-выхаваўчым працэсе (для выкладчыкаў) — **13.03—25.03;**

**13.** Выхаваўчы патэнцыял мастацкай культуры Беларусі: традыцыі і навацыі (для выкладчыкаў) — **20.03—01.04;**

**14.** Цэнтралізаванае тэсціраванне і адзіны дзяржаўны экзамен у РБ: вопыт, праблемы, шляхі вырашэння (для выкладчыкаў) — **20.03—25.03;**

**15.** Гісторыя Беларусі ў кантэксце гісторыі ўсходнеславянскай цывілізацыі (для выкладчыкаў ВНУ) — **20.03—01.04.**

### Перападрыхтоўка з прысваеннем кваліфікацыі:

**16.** "Менеджэр у сферы адукацыі" (для спецыялістаў і выкладчыкаў ВНУ) — вочна з **09.01.2006 па 29.06.2007** (па этапах);

**17.** "Спецыяліст па ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце" (для спецыялістаў і выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — вочна з **09.01.2006 па 23.12.2006** (па этапах);

**18.** "Спецыяліст па педагагічных вымярэннях" (для супрацоўнікоў сістэмы адукацыі) — вочна з **09.01.2006 па24.06.2007** (па этапах).

**Калі Вас зацікавіла наша інфармацыя і Вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце (222-83-03, 200-20-47) для папярэдняга запісу ў групы.**

**Наш адрас: 220001, г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, каб.319, тэл/факс 200-25-51.**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты — Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

17 лістапада 2005 года
Падпісана да друку 16.11.2005 г.
Зак.1052 . Тыраж 1000 экз.Ум. друк. арк. 1
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Таццяна КАЗАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная рэдакцыі: вул. Бабруйская, 7,
пакой 411, тэлефон 209-53-45,
e-mail: Gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by